Р. С. Калаур

# ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЦЬ РСФСР У ГІСТОРЫІ СТВАРЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

*Разглядаюцца малавядомыя старонкі дзяржаваўтваральных працэсаў на беларускіх землях у 1917 - 1918 гг.*

Першым крокам да утварэння Заходняй вобласці лічыцца аб'яднанне Мінскай губерні і Дзісенскага, Ашмянскага і Вілейскага ўездаў Віленскай губерні ў чэрвені 1917 г.

Неўзабаве пасля пачатку рэвалюцыйных падзей ў кастрычніку 1917 г. арганізацыі РСДРП(б) вялі актыўную работу па замацаванні новай улады. Яны атрымалі падтрымку на з'ездзе Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў Заходняй вобласці (18 - 21 лістапада), III з'ездзе Саветаў сялянскіх дэпутатаў Мінскай і Віленскай губерняў (18 - 20 лістапада), II з'ездзе армій Заходняга фронту (20 - 25 лістапада). 27 лістапада ў адпаведнасці з рашэннямі з'ездаў выканкамы з'ездаў ўтварылі выканаўчы камітэт Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў Заходняй вобласці і фронту (Аблвыканкамзах) на чале з М. Рагазінскім. Абласны камітэт сфарміраваў Савет народных камісараў (СНК) Заходняй вобласці і фронту (старшыня – К. Ландар), які ўзначалі палітычную і гаспадарчую дзейнасць Саветаў. Віцебская і Магілёўская губерні лічылі сябе самастойнымі і прызнавалі вышэйшым органам улады ЦВК і СНК РСФСР.

У лютым 1918 г. цэнтр Заходняй вобласці з-за наступлення немцаў быў перанесены ў Смаленск, хоць ён і не ўваходзіў у яе склад. Толькі ў адпаведнасці з рашэннем II з'езда Саветаў Заходняй вобласці (10 - 14 красавіка 1918 г.) у яе склад была ўключана Смаленская губерня і Мглінскі ўезд Чарнігаўскай губерні. Пастановай III з'езда Саветаў Заходняй вобласці (11 - 13 верасня 1918 г.) яна была перайменавана ў Заходнюю камуну з цэнтрам у Смаленску. У кастрычніку 1918 г. Народны камісарыят унутраных спраў РСФСР адобрыў існаванне Заходняй камуны (Смаленская, Віцебская і Магілёўская губерні) як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Савецкай Расіі. У пастанове адзначалася, што пасля выгнання захопнікаў межы камуны павінны ўключаць тэрыторыю Беларусі і Літвы (Мінскую, Магілёўскую, Віцебскую, Смаленскую, Гродзенскую, Віленскую і Ковенскую губерні з насельніцтвам 15 млн чалавек і тэрыторыяй звыш 300 тыс кв. км) як адзіны адміністрацыйны і эканамічны раён Расіі. Заходняя камуна разглядалася расійскім кіраўніцтвам толькі як адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, якая не насіла нацыянальнага характару. Аднак 30 снежня 1918 г. на VI ПаўночнаЗаходняй партыйнай канферэнцыі РКП(б), якая абвясціла сябе I з'ездам КП(б)Б, была прынята рэзалюцыя "Аб абвяшчэнні Заходняй Камуны Беларускай Савецкай Рэспублікай". У склад рэспублікі павінны былі ўвайсці Мінская, Магілёўская, Гродзенская губерні цалкам, амаль уся Віцебская губерня (без трох заходніх паветаў), па 4 паветы Смаленскай і Чарнігаўскай губерняў, частка Нова-Аляксандраўскага павета Ковенскай губерні, увесь Вілейскі павет, частка Свянцянскага і Ашмянскага паветаў Віленскай губерні, Аўгустоўскі павет Сувалкаўскай губерні. 1 студзеня 1919 г. Заходняя камуна спыніла сваё існаванне ў сувязі са стварэннем Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусі.

### *Спіс літаратуры*

1. Кукса, А. Н. На пути к самоопределению народов Беларуси и Украины: советская модель государственности/ А. Н. Кукса. - Минск: БНТУ, 2012. - 348 с.

*Калаур Раман Сяргеевіч,* студэнт 1 курса факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання Беларускага дзяржайнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, roman.kallaur@gmail.com.
*Навуковы кіраўнік: Мікалаева Людміла Віктараўна,* загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, Mikalayeva@bsuir.by.